Przesyłka opłacona ryczałtem
№ 2 (31) Нядзеля 23-га студня, 1927 г. м. Вільня Год II

Беларускае Слова

Выходзіць Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.—Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.—Барацьба з комунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ 3 „ 2 зл. 50 гр.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Fabryczna 39.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

Ліквідацыя Грамады.

Разгром Грамады, Niezależnej Partji chłopskiej і Комуністычнай партыі. Арышт комунізуючых паслоў.

Арышты ў Вільні.

Уначы з 14 на 15 студня адбыліся ў Вільні вобыскі і арышты сярод комуністычных дзеячоў і арганізацыяў.

Вобыскі адбыліся: ў памешканьні Цэнтральнага Сэкрэтарыяту Грамады, дзе паводле „Słowa" і „Kurjera Wil." знойдзена шмат кампрамітуючага матэрыялу, як інструкцыі комінтэрну, шыфр для тайнае карэспандэнцыі, расьпіскі на грошы выданыя на комуністычную работу і значная сума даляраў. Тут жа былі заарыштаваны пасол Валошын, сэкрэтар Бурсэвіч і некалькі супрацоўнікаў сэкрэтарыяту. Памешканьне сэкрэтарыяту апячатана.

Падчас рэвізіі у Беларускім банку высьнена, што гэты банк займаўся пераводам праз Рыгу савецкіх грошы на працу Грамады. „Kurjer Wileński" падае, што ў банку знойдзена 500,000 злотаў. Забраны кнігі і дакуманты, даказываючыя праступную дзейнасьць банку.

Аднача сна адбыліся рэвізіі ў Галоўнай Управе Т-ва Беларускае Школы, у памешканьнях прафэсыянальных саюзаў, у рэдакцыях газэт „Наша Справа" і „Narodny Zwon" і ў прыватных памешканьнях дырэктара Астроўскага, паслоў Тарашкевіча і Рака-Міхалоўскага, Антона Луцкевіча і інш.

Газэты падаюць, што ў кватэры пасла Тарашкевіча знойдзены інструкцыі як тварыць арганізацыі комуністычнай партыі.

Заарыштаваны ў Вільні: паслы Тарашкевіч, Валошын і Рак-Міхайлоўскі, апошняга затрымалі на вагзале пры спробе выехаць з Вільні ў напрамку Баранавічаў, (да Саўдэпіі? Рэд.) дырэктар Астроўскі, Коўш, Шнаркевіч, Назарук, Мэнке, Марцінчык, Навакоўскі, Бурсэвіч, Алейнічак, Вагнэр і Кравец. Частка арыштаваных належыць да цэнтральнага камітэту Грамады, частка да Комуністычнае Партыі Заходняй Беларусі.

На падставе знойдзенага матэрыялу даказана, што Грамада зьяўляецца выразна-комуністычнай арганізацыяй і імкнулася да арганізацыі аружнага паўстаньня, каб далучыць Заходнюю Беларусь да С.С.Р.Р.

Усе арыштаваныя, апрача Марцінчыка і Мэнкэ, якіх пазьней выпусьцілі, зьмешчаны ў Лукішскай турме.

На провінцыі.

Адбыліся арышты і вобыскі на ўсім абшары ваяводзтваў Віленскага, Навагрadzкага, Беластоцкага і Палескага.

Зроблены вобыскі ў аддзелах Беларускага Банку у Глыбокім і Пінску. Дырэктар Глыбоцкага аддзелу Сакалоўскі арыштаваны, бо даказана ягоная сувязь з комуністамі.

Дакладных даных аб арыштах грамадаўцаў на вёсцы німа. Вядома толькі, што ў Навагрadзкім павеце арыштавана 56 асоб, Горадзенскім — 34, Беластоцкім 22, Сакольскім — 12, Ваўкавыскім — 9, Бельскім—20.

Арышты і вобыскі трываюць далей.

Польшчы.

Ліквідацыя комуністычнае партыі адбылася і па ўсей Польшчы.

У Пазнані заарыштаваны сябры Ц. К. Комуністычнае Партыі Польшчы. Арыштаваны інструктары і агітатары.

У Варшаве зроблена 200 вобыскаў, прычым арыштавана 80 чалавек. Знойдзена аружжа, фальшывыя пашпарты і іншы кампрамітуючы матэрыял.

Адбыліся арышты ў Торуні, Седльцах і інш. гарадох.

Урадовы камунікат.

У сувязі з адбываючайся ліквідацыяй комуністычных арганізацый Урад выдаў гэткі камунікат:

Пэўныя арганізацыі, каторыя ўжо даўгі час працуюць на тэрыторыі Польскае Дзяржавы, праводзяць акцыю, кошты якой зусім відавочна перавышаюць магчымасьць гэтых арганізацый пакрываць іх уласнымі сродкамі. Вялікая аплата інструктароў, агітатараў, агэнтаў; выдаваньне цэлага раду брашураў, адозваў і газэт — дарма рассыланых, урэшце апэрацыі вялікімі грашовымі сумамі, разданымі ў форме беззваротных пазыкаў з мэтай зьдабаньня сабе прыхільнікаў — сьведчыць бязумоўна аб тым, што дзейнасьць гэтых арганізацый аплачываецца чужымі чыньнікамі.

На чале гэтых арганізацый стаяла некалькі паслоў Сойму, якія шырока распараджаліся сумамі — паходзячымі з чужых крыніцаў.

Урад ня можа надалей цярпець такой дзейнасьці, скіраванай на шкоду польскае дзяржавы і роўнай здрадзе дзяржавы. Ня можа і ня хоча дапусьціць да пашырэньня сярод спакойнага жыхарства замяшаньня і бяскарнага тварэньня праступных плянаў, праяўленьня па прыказу чужых чыньнікаў—якіх небудзь разрухаў у дзяржаве. Дзеля гэтага арыштаваны паслы: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і агітатары, каторыя стаялі на чале арганізацыяў, аплачываных з чужых сродкаў.

Перасьцерагаецца, што належаньне да гэтых арганізацыяў, на чале каторых стаялі арыштаваныя паслы, будзе перасьледавацца з усей строгасьцю, як дзейнасьць на шкоду дзяржавы.

Вільня, 15 студня 1927 г.

Арышт паслоў Мятлы і Галавача

Арыштаваны ў Дзісьненскім павеце грамадаўскі пасол Мятла.

Арыштаваны ў Навагрadзкім ваяводзтве пасол з Niezal. Partji chłop. Галавач.

Абодва дастаўлены на Лукішкі.

Маршалак Сойму Ратай адмовіўся ад трэбаваньня звальненьня арыштаваных паслоў.

Паводле канстытуцыі маршалак Сойму мае права трэбаваць звальненьня арыштаваных паслоў.

Гэтак і маршалак Сойму Ратай спачатку інтэрвэньяваў у справе заарыштаваных паслоў у міністра справядлівасьці, які пераслаў марш. Ратаю абшырныя пісьмы з матывамі арыштаў, Ратай адмовіўся ад трэбаваньня, каб паслоў звольнілі.

Марш. Ратай сказаў, што ня хоча на сябе браць адказнасьці за звальненьне паслоў і перадасьць справу Сойму.

Яшчэ і яшчэ раз.

Ад мамэнту маёвага перавароту Беларускі Народ чакае рэформаў.

Рэформаў няма. І тое, што сяньня робіцца па беларускіх гарадох, мястэчках і вёсках ёсьць рэзультатам зацяжкі Ўраду з гэтымі рэформамі.

Ці-ж патрэбны былі-бы гэтыя масовыя арышты грамадаўцаў, ці мела-бы наагул якую-небудзь сілу Грамада, каб справядлівыя жаданьні народу споўніліся-б і рэформы прыйшлі-бы ў час? Рашуча скажам, — не! Праўда, не малую ролю ў акцыі Грамады адыгрывае нашы Чырвоны Сусед, які ўжо не ў першы раз працягвае сваю лапу па Заходнюю Беларусь. Гэтак была ў 1923 — 1925 годзе, калі Саветамі быў арганізованы крэсовы бандытызм. Тады шовіністычная прэса абвінавачвала ўвесь Беларускі Народ у бандытызме. Цяпер, пры факце камрамітацыі Грамады кантактам з Комінтэрнам—зноў падняўся вой у правай прэсе проціў усяго Беларускага Народу, а знача перадусім проціў нацыянальнага беларускага руху, які гэтак непадабаецца рожным „Абозам Вялікай Польшчы" і іншым шовіністычным партыям. У 1925 годзе мы даказвалі, што абвінавачваньні ў бандытызме ўсяго беларускага насяленьня — абсурд, і былі правы. Гэтак заяўляем і сяньня, што народ у сваей масе проціў комуны і комуністаў. Грамада мела пасьпех перадусім як арганізацыя антыпольская, дзякуючы таму, што Польшча да гэтага часу адносілася да беларусаў, як мачыха. І пакуль на чале ўрадаў стаяла шовіністычная правіца, — народ чакаў таго часу, калі прыдзе да ўлады дэмакратыя польская.

Вось дзеля чаго пасьля маёвага перавароту народ пачаў гэтак нецярпліва трэбаваць рэформаў. Рэформы ня йшлі, варункі жыцьця вёскі пагоршыліся, падаткі вялікія, а заработкаў няма ніякіх; прырост насяленьня што год, а адліву ані ў Амэрыку, ані ў Расею, як гэта было раней, амаль зусім няма. Разгарычэньне расло. Гэты падатны грунт выкарысталі закардонныя бальшавікі пусьціўшы ў народ арганізацыю Грамады.

Сяньня ідуць масовыя арышты. Але аднымі арыштамі і наагул прэсіямі нічога ня зробіш. Ня раз мы на шпальтах нашае газэты трэбавалі рэформаў, указываючы, што перадусім у інтарэсе Дзяржавы гэтыя рэформы павінны быць дадзены. Не раз Беларуская Нацыянальная Рада зварачвалася з мэморыяламі да ўлады. Складала мэморыялы і Т-ва „Прасьвета" з жаданьнямі культурна-асьветнымі. І сяньня, калі Урад меў адвагу заняць пэўнае становішча ў нацыянальным беларускім пытаньні, пачаўшы ад рэпрэсыяў у адносінах да антыдзяржаўных арганізацыяў, дык Урад павінен побач з рэпрэсіямі выявіць аднача сова і творчую ініцыятыву, даўшы неабходныя рэформы. У 1001 раз кажам: жадаем сваей нацыянальнай школы, жадаем утварэньня настаўніцкіх урадовых курсаў у Вільні, жадаем матэрыяльнага падтрыманьня нашым гімназіям, жадаем утварэньня вучыцельскай сэмінарыі; каб зямля вызначаная ўжо на парцэляцыю пайшла выключна на карысьць мейсцовага сялянства, а не для асадніцтва; трэбуем направы гаспадарчай, трэбуем шырокага самаўраду. Гэта трэбаваньні нашыя сяньняшняга дня, без якіх супакой на нашых землях ніколі не наступіць.

?

Для каго можа быць сэкрэтам, што фактычным кіраўніком і інспіратарам Грамады ёсьць Антон Луцкевіч? Хто ня ведае, што фактычным рэдактарам органаў Грамады, розных „Справаў" ёсьць Антон Луцкевіч? Хто будзе пярэчыць, што ўся фінансавая старана (комінтэрнаўская торба з грашыма) знаходзілася ў фактычным распараджэньні таго-ж Луцкевіча? Хто ня ведае, што знамяніты каапэратыўны банк кіраваўся ім жа і знаходзіўся ў аднэй хаце з Луцкевічам?... Гэты ж Луцкевіч ёсьць кіраўніком Белкому. Ен-жа прэзэсам „Мопру".

З другога боку на публічныя закіды беларускага грамадзянства, што Луцкевіч служыў усім „арыентацыям" (контрразьведкам!) ён не запярэчыў.

У 1921 годзе адбыліся масовыя арышты ў Вільні у рэзультаце якіх было арыштавана і выслана 33 беларускіх палітычных і культурных працаўніка. Луцкевіч застаўся незачэпліным... На гэтых днях адбыліся зноў масавыя арышты грамадаўцаў. Арыштаваны нават паслы і цэлы шэраг грамадаўскіх культурнікаў, як Астроўскі, Шнаркевіч і інш. Арыштаваны цалком цэнтральны камітэт Грамады. Луцкевіч зноў мае шчасьце? Няхай кожны беларус задумаецца над гэтым!

Дэклярацыя Беларускай Нацыянальнай Рады.

У сувязі з масовымі арыштамі комуністычнага элемэнта і ліквідацыяй Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады – Беларуская Нацыянальная Рада лічыць абавязкам забраць свой голас.

Як арганізацыя актыўна-антыбальшавіцкая, вядучы свае традыцыі ад часоў слаўнага Слуцкага паўстаньня, Беларуская Нацыянальная Рада бачыць у мамэнце рашучай барацьбы Ураду Маршалка Пілсудскага з комунізмам, гістарычны зварот ў падзеях Польшчы на рубяжох усходніх Эўропы і прыпамінае з жалем тыя часы, калі масы Беларускага Народу ў барацьбе з бальшавізмам, за сваю волю — не знайшлі зразуменьня і адпаведнага падтрыманьня Народу Польскага.

Разумеючы, што комунізм пад прыкрыўкай тварэньня псэўда-нацыянальных дзяржаўных арганізмаў—праводзіць паводле сваей ідэолёгіі і праграмы работу, якая забівае усялякі адраджэнчы рух, Беларуская Нацыянальная Рада з мамэнту апанаваньня Беларускай Сялянска - Работніцкай Грамады праз комуністычныя чыньнікі, энэргічна прыступіла да барацьбы з Грамадой, асягнуўшы ў гэтай барцьбе пасьпех і ачысьціўшы некаторыя паветы, як напр. Несьвіжскі, зусім ад грамадаўскай заразы.

Аднак-жа ў момант масовых арыштаў, якія адбываюцца на нашых землях, Беларуская Нацыяналная Рада падымае свой голас у абароне гурткоўцаў. Не правадыроў, не эмісараў і платных бальшавіцкіх агэнтаў, але той шэрай сялянскай масы, якая ў нязмерна цяжкіх эканамічных варунках, утраціўшы надзею ў направу, пайшла на ману шырокіх абяцанкаў Грамады.

Няхай правадыры адказваюць за сваю дзейнасьць, але мы пратэстуем проці масовых арыштаў сялян. Роўным чынам пратэстуем проці тэндэнцыяў шовіністычных газэтаў, скіраваць удар па Грамадзе на ўвесь Беларускі Народ.

У атмасфэры разгарычэньня, няверы і безнадзейнага шуканьня легальных дарог для направы свайго лёсу, тварыліся гурткі Грамады.

Тыя шэрыя сьвіткі на беларускіх вёсках —былі далёкімі ад антыдзяржаўных плянаў сваіх правадыроў.

Ім хадзіла аб зямлю, якой не хапала, хадзіла аб роднай школе, якую ім не давалі, хадзіла нарэшце аб направе немагчыма цяжкіх варункаў свайго жыцьця.

Дзеля гэтага Беларуская Нацыянальная Рада констатуючы з задаваленьнем новы цьвёрды курс Ураду Маршалка Пілсудскага ў барацьбе з комунізмам, перасьцерагае перад магчымасьцю перасьледаваньня мясцовай уладай самага Беларускага Нацыянальнага руху.

Прымаючы з поўным задаваленьнем цьвёрдыя крокі Ураду ў адносінах да ўсіх элемэнтаў, якія праводзяць комуністычную працу, Рада падкрэсьляе, што ўрадовая антыкомуністычная акцыя толькі тады дасьць

пазытыўныя рэзультаты, калі побач прэсаў будуць праводзіцца неабходныя рэформы.

Беларуская Нацыянальная Рада лічыць неабходным незабаўнае прадастаўленьне беларускім лёяльным у адносінах да Дзяржавы арганізацыям, канцэсіяў так у галіне культурнай: утварэньня сеткі беларускіх школаў, утварэньня ў Вільні курсаў дла беларускіх настаўнікаў, адчыненьня вучыцельскай сэмінарыі, матэрыяльнай дапамогі беларускім гімназіям і г. д.; як і ў галіне гаспадарчай: распарцэляваньня вызначаных абшараў зямлі выключна сярод мяйсцовага насяленьня і недапушчэньня новага асадніцтва пры далейшай рэалізацыі зямельнай рэформы і г. д. Нарэшце правядзеньня у жыцьцё шырокага сама ўрада на Крэсах, як першага этапу аўтаноміі на Крэсах. Рэформы і цьвёрдая, але справядлівая Улада радыкальна ачысьціць нашыя землі ад заразы бальшавізма, узмацняючы пры гэтым самую Дзяржаву, зьніштажаючы ўсё тое, што сяньня стаіць на перашкодзе еднасьці грамадзян нашага Краю.

Беларуская Нацыянальная Рада

Вільня, 18 студня 1927 г.

Гэтая дэклярацыя Беларускай Нацыянальнай Рады перададзена Уладзе і разаслана віленскай і варшаўскай прэсе.

Палітычны агляд.

Яшчэ здаецца ніколі ад часу скачэньня сьятовай вайны палітычная сытуацыя ў Эўропе, Азіі і Амэрыцы ня была гэтак крытычнай, як цяпер. І ў той час, як у Эўропе ўжо даўно вядзецца закрытая вайна пад рознымі відамі, у Азіі і ў Амэрыцы яна ідзе поўным ходам зусім адкрыта.


Палажэньне ў Кітаі у апошні месяц вельмі завастрылася. Нерашучая і нявыразная палітычна вялікіх дзяржаваў з аднаго боку і больш інтэнсыўная палітыка Радавай Расеі з другога боку давялі да таго што збройная спатычка кітайцаў з чужаземцамі стала няміначай. У той час, як дыктатар Манджурыі Чанг-Тсо-Лін заняў палітыку чаканьня, чырвоны Кантон, цкаваны і падтрымліваны бальшавікамі, так узмацніўся і асьмеліўся, што абвявіў адкрытую вайну чужаземцам, пачынаючы з англічан. Апошнія ўжо даўно заўважылі надыходзючую буру і хацелі адхіліць яе шляхам уступак, якія толькі давалі яшчэ больш сьмеласьці і рашучасьці кітайцам усіх палітычных кірункаў адносна чужаземцаў. Яшчэ ў канцы мінуўшага года ангельскі урад зьвярнуўся да кітайскага цэнтральнага ўраду у Пэкіне з прапазыкай пераглядзець існуючыя дагаворы вялікіх дзяржаваў з кітайцамі, прапануючы важныя уступкі. Адначасна ангельскі міністар замежных справаў Чэмбэрлен зьвярнуўся да вялікіх дзяржаваў, заінтэрасаваных у Кітае, з мэмарандумам, у якім высьвятляе новы курс ангельскай палітыкі ў Кітаі і прапануе апошнім далучыцца да гэтай акцыі. А пакуль быў атрыманы адказ ад тых і другіх, спрабавалі ўвайсьці ў безпасрэднае паразуменьне з Кантонам. Але на ўсіх фронтах англічан спаткал няўдачы. Кантон зусім адмовіўся ад перагавораў з англічанамі. Гэтак сама і цэнтральны пэкінскі ўрад не даў пазытыўнага адказу. А вялікія дзяржавы, як Японія, Амэрыка і Францыя далі з сім ухільныя адказы, ня хочачы псуць сваіх больш магчымых адносінаў з кітайцамі. А ў гэты час Кантон пачаў рашучую акцыю проці англічан, якія да гэтай пары мелі найбольшы ўплыў у палуднёвым Кітаі, пасьля новага году кантонцы напалі на англічан у сваей новай сталіцы Ханькоў, перанесянай з Кантону, зьдзёрлі ангельскі нацыянальны штандар з гмаху ангельскага консульства і захапілі ангельскія канцэсіі. Не дайшло да кравапраліцьця і больш паважных здарэньняў толькі дзякуючы разважнай і тактычнай паставе ангельскіх вайсковых атрадаў. Аднак ня толькі англічанам, але нават і іншым чужаземцам прыйшлося амаль зусім пакінуць Ханькоў і іншыя гандлёвыя пункты і перасяліцца на параходы пад ахрану ваеннага флёта ўсіх дзяржаваў. Гэткая доля чакала і Шанхай, найвялікшы пункт чужаземнага гандлю і прамысловасьці ў Кітаі. Але дзякуючы часовай перамозе гэн. Фана над кантонцамі, пагрозы Шанхаю пакуль што няма, хаця кантонскі дыктатар пакляўся, што 2 лютага, на новы кітайскі год, ён абавязкава атакуе Шанхай. Наагул на гэты дзень чакаюць агульнага выступленьня усіх кітайцаў проці чужаземцаў. Дзеля гэтага англічане, амэрыканцы, французы, італьянцы і іншыя заварушыліся. Сьпешна высылаюцца вайсковыя падкрапленьні і ваенны флёт стаіць у баявой пагатове на выпадак аружнага выступленьня проціў „узбунтаваўшагася“ Кітая Але ці ня позна ўжо? Здаецца прапушчаны падыхадзячы мамэнт, калі яшчэ можна было апанаваць сытуацыю пры агульным згодным выступленьні вялікіх дзяржаваў нават без усякага кравапраліцьця. Цяпер гэта тым больш немагчыма, што між самімі вялікімі дзяржавамі такія адносіны, што можна чакаць кожную хвілю амаль што аружнай стычкі. Маюцца на ўвазе падзеі ў Сярэдняй Амэрыцы.

У Сярэдняй Амэрыцы паміж Злучанымі Штатамі і Палуднёвай Амэрыкай маецца маленькая рэспубліка Нікарагуа з 2 мільёнамі жыхароў. І ў ёй нядаўна ўспыхнула хатняя вайна паміж кансэрватарамі, на чале якіх стаіць цяперашні прэзыдэнт Діац і лібэраламі пад кіраўніцтвам Сакасы. Повады гэтай барацьбы мала каго цікавяць, як і наагул ніхто не зьвярнуў бы ніякай увагі на рэвалюцыю ў нейкай там Нікарагуа, калі б з гэтым ня былі зьвязаны спрэчныя інтарэсы вялікіх дзяржаваў, як Злучаныя Штаты і Японія, якія канкуруюць між сабою ў у Ціхім акіяні. Часта здараюцца рэвалюцыі і дзяржаўныя перавароты нават у большых Палуднёва-Амэрыканскіх рэспубліках, як Бразылія, дзе і цяпер яшчэ ня скончылася хатняя вайна, Чылі і інш., і ніхто за граніцай не зьвяртае на гэтае ўвагі. У лёсе-ж Нікарагуа заінтэрасаваны безпасрэдная Злучаныя Штаты і пасрэдна Японія. Вось у гэтым і ляжыць повад, дзеля чаго на ўнутраныя падзеі ў маленькай Нікарагуа зьвернута ўвага ўсяго сьвета.

Як цяпер ўжо выясьнілася, самая хатняя вайна ў Нікарагуа ўспыхнула не сама сабою, а дзякуючы тайным інтрыгам з аднаго боку Злучаных Штатаў, якія падтрымліваюць консэрватараў і цяперашні ўрад Діаца, з другога боку суседняй Мэксыкі, падтрымліваючай узбунтаваўшыхся лібэралаў. Злучаныя Штаты заінтэрасаваны ў лёсе Нікарагуа дзеля таго, што яна, як займаючая самую вузкую часьць Сярэдня Амэрыканскага перашэйка і маючая цэлую групу вазёр, прадстаўляе найбольш выгаднае мейсца для прарыцьця канала, зьвязываючага Вялікі Акіян з Атлантыцкім З гэтым плянам Амэрыка носіцца ўжо даўно, дзеля таго, што Панамскі канал не адпавядае яе мэтам. Яшчэ ў 1916 г. Злуч. Штаты атрымалі ад нікарагуанскага ўраду права на прарыцьце гэтага каналу і заплацілі тады за гэта 3 мільёна даляраў. Але амэрыканскім банкам мала таго, каб толькі мець у сваіх руках канал Для большага спакою ім трэба палажыць сваю апякунчую руку на ўсю тэрыторыю Нікарагуа. А калі-б толькі гэта здарылася, дык на гэтым не застанавілася б. Нікарагуа прышлося бы падзяліць паміж іншымі рэспублікамі Сярэдняй Амэрыкі, у тым ліку і Мэксыцы Але ізноў трэба запатаваць, што гэта не вызвала бы вялікага перапалоху сярод сусьветных вялікіх даяржаваў, калі-б ня было пагрозы для незалежнасьці Мэксыкі, дзе маюцца багацейшыя крыніцы нафты А апошняя, як ведама, мае ў сучасны мамэнт гэткую магнітную моц, што прыцягае да сябе ўсе вялікія дзяржавы і дзе толькі ёсьць нафтовыя крыніцы, як нпр. у Масуле, там паўстаюць міжна одныя канфлікты. Адсюль зразумела, што ні Англія ні тым больш Японія, маючыя свае канцэсыі ў Мэксыцы, не згодзяцца дабравольна на тое, каб Злуч. Штаты захапілі для сябе гэткі кавалак. Яшчэ ў 1922 г. Японія заключыла з Мэксыкай тайны дагавор, на падставе якога забавязана даць ваенную дапамогу на выпадак вайны яе з Злучанымі Штатамі. Вось дзеля чаго толькі апошнія пакуль што лічацца з Мэксыкай, за сьпіной якой стаіць Японія і часткова Англія. Але ня гледзячы на гэта амэрыканскі ўрад рашуча ўмяшаўся ў унутраны рэвалюцыйны рух Нікарагуа і пад відам абароны законнага урада Діаца высадзіў свой ваенны дэсант і заняў важнейшыя пункты. Між тым рэвалюцыйны рух яшчэ ня спыніўся і ёсьць паважныя трывогі, што можа дайсьці да аружнага спатканьня з Мэксыкай, якое ў сваю чаргу выклікала-б аружны канфлікт і з Японіяй, з якой у Амэрыкі вельмі дрэнныя адносіны. Цяпярэшні канфлікт у Амэрыцы напамінае сабою Сараеўскі выстрал, які пацягнуў за сабою ўмешацельства Аўстра-Вэнгрыі, а потым вызваў сусьветную вайну.

N.

Вайна у Кітаі.



Антыбальшавіцкі гэнэрал Ву-Пэй Фу.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

АНГЛІЯ ДЗЯКУЕ ПОЛЬШЧЫ. Ангельскі пасол у Варшаве выказау ад імя ангельскага ўраду—ураду польскаму падзяку за прысылку каменнага вугля падчас ангельскай забастоўкі, што ў значнай меры аблягчыла палажэньне насяленьня ў Англіі

НОВЫ МІНІСТАР АСЬВЕТЫ. Прэзыдэнт Польскае Рэспублікі 9 студня падпісаў дэкрэт аб назначэньні новага міністра асьветы. Папярэдні міністар Бартэль звольнены. Новы міністар Г. Добруцкі зьяўляецц сэнатарам і належыць да Клюбу Працы.

ПРЫГАВОР У СПРАВЕ БАРТАШЭВІЧА Закончыўся ў Варшаве суд над камандорам Барташэвічам і К-о за надужыцьці. Галоўны абвінавачаны Барташэвіч атрымаў 5 гадоў катаргі. Іншыя абвінавачаныя па некалькі месяцаў турмы.

ПОЛЬСКІ ПАСОЛ У С. С. Р. Р. Нова вызначаны польскі пасол Станіслаў Патэк выехаў да Масквы. Праважалі Патэка шмат заграгічных паслоў. Разам з ім выехаў гандлёвы радца пасольства Забіцкі.

ДАХОДЫ ДЗЯРЖАВЫ У 1926 ГОДЗЕ. У месяцы сьнежні 1926 г. бюджэтныя даходы польскае дзяржавы раўняліся 235.368 тысячаў злотых, выдаткі 224.070 тысячаў зл. Даходы перавышаюць выдаткі на 11.238 тысячаў зл.

За цэлы 1926 год даходы дзяржавы раўняюцца 1.905.570 тысячаў зл., што складае 125 працэнтаў прадбачаных сумаў, выдаткі раўняюцца 1.852.070 тысячаў зл. што складае 107 працэнтаў прадбачаных сумаў. Знача надвышка даходу над выдаткамі раўняецца 53.500 тысячаў злотых польскіх

АПЛАТЫ ЗА ВЫВАЗ ЗБОЖА. Каб перашкодзіць ўзросту цэнаў на збожа ўрад пастанавіў увясьці ў найбліжэйшым часе вывазныя аплаты ад збожа.

ПРАЦЫ КАМІСІІ ЭКСПЭРТАЎ ПА СПРАВАМ МЕНШАСЬЦЯЎ. Камісія экспэртаў па справам ўсходніх ваяводзтваў і нацыянальных меншасьцяў пры палітычным кабінэце рады міністраў распачала сваю сэсію 9 студня. Удзел у паседжаньнях прымаюць экспэрты: Лявон Васілеўскі, др. Лёвэнгэрц і Т. Голувка, ад імя міністэрства ўнутраных справаў удзел у наседжаньнях прымаюць дырэктар палітычнага дэпартаманту др. К. Сьвітальскі і начальнік аддзелу нацыянальных меншасьцяў Сухэнэк.

Др. Сьвітальскі прадставіў справаздачу з дзеяльнасці ўраду ў галіне ўваходзючай у межы кампэтэнцыі камісіі экспэртаў за час ад апошняй сэсіі камісіі. Далей камісія прыступіла да абгаварэньня справаў, запрапанованых урадам для ўстанаўленьня сваей апініі аб іх. На першым пляне знаходзяцца справы, датычачыя ўкраінскага і беларускага насяленьня ў галіне адміністрацыйнай гаспадарчай і культурнай.

ПРАВАСЛАЎНЫ ЗЬЕЗД. У Варшаве адбыўся праваслаўны зьезд, склікаты мэтрапалітам Дзянісам На зьезьдзе прымала ўдзел духавенства і царкоўныя старасты. Зьезд выявіў, што паміж вышэйшай царкоўнай уладай і духавенствам з праваслаўным насяленьнем у Польшчы пануе поўная аднамыснасьць і згода аб патрэбе абаперці царкоўнае жыцьцё на саборных падставах.

За граніцай.

ПРАВАЛ КОМУНІСТАЎ НА ВЫБАРАХ ДА БЭРЛІНСКАГА МАГІСТРАТУ. На выбарах да бэрлінскага магістрату комуністы не атрымалі аніводнага мандату. Раней яны мелі двух прадстаўнікоў.

ВЫБАРЫ У ФРАНЦУСКІ СЭНАТ. 9 студня адбыліся выбары да францускага сэнату. Згодна конституцыі лік сэнатараў раўняецца 300, якія выбіраюцца на 9 гадоў, але каждыя тры гады адбываюцца перавыбары трэцяй часткі.

Дык і апошнія выбары вялікага значэньня мець ня могуць, бо выбіралася толькі 100 сэнатараў.

КАНЕЦ НЯМЕЦКАГА КРЫЗІСУ. Прэзыдэнт Гіндэнбург даручыў тварэньне кабінэту міністраў Марксу, былому старшыні рады міністраў.

КАНФЛІКТ ПАМІЖ ЗЛУЧАНЫМІ ШТАТАМІ І МЕКСЫКАЙ Пасьля таго, як лібэральнае войска ў Нікарагуа пабіла кансэрватараў, каторых падтрымлівалі Злучаныя Штаты, зьяўляецца магчымай вайна паміж Злучанымі Штатамі і Мэксыкай, бо мэксыканцы, як ведама, падтрымлівалі лібэралаў. Аднак Зл. Штаты не пагадзіліся з гэтым і выслалі свае войскі і флёт да Нікарагуа

Гэтак амэрыканцы захапілі ўжо ў свае рукі галоўныя чугуначныя лініі. Мэксыка ня можа згадзіцца з інтэрвэнцыяй амэрыканцаў

Раскол у „Маладняку“.

(Працяг).

Выразную крытыку „Узвышша“ знаходзім у артыкуле Т. Глыбоцкага, таксама асабістасьці невядомай, „З узвышшаў у даліну“.

„У кароткім артыкуле няма магчымасьці спыніцца над творчасьцю выдатнейшых сябраў „Узвышша“, як К. Чорнага, З. Бядулі і іншых, але іх творчасьць прадстаўляе сабой — мудраваньне над словам, над рыфмаю, над вобразам“.

„Падыход „Узвышша“ да ацэнкі мастацкіх твораў ня мае нічога супольнага з падыходам марксыцкім; Бабарэка (ідэолёг „Узвышша“. Рэд.) ня лічыць мастацкім творам той твор, які адбівае інтарэсы таго ці іншага дня, той, ці іншай грамады людзей, якую мастак вырашае ў пісьменстве“.

Бабарэка, відаць, правільна падыходзіць да справы і ня лічыць агітацыйную комуністычную літэратуру прыгожым пісьменствам.

І далей:

„Адыход ад „Маладняка“ групы „Узвышша“ ішоў нібыта па лініі арганізацыйных разыходжаньняў. Асабістыя спрэчкі, разнагалосьсі ў мэтадах працы, слабое кіраўніцтва—вось здавалася, тыя прычыны, па якіх разыйшлися дзьве трупы. Па сутнасьці гэта далёка ня так. У кожным расколе, якімі-б надворнымі лёзунгамі ён не прыкрываўся, трэба шукаць, у першую чаргу, матываў палітычных і ідэолёгічных. Дыфэрэнцыяцыя ў літэратурнай арганізацыі можа выклікацца толькі адпаведнымі працэсамі ў сацыяльных напластаваньнях“.

Далей Глыбоцкі констатуе разьвіцьцё палітычнае актыўнасьці розных пластоў насельніцтва, галоўным чынам сялян Гэтак ужо ў 1924—25 гадох заможныя групы сялянства выявілі сваю палітычную актыўнасьць даволі выразна. Яны выступалі на перавыбарах ...аў, выстаўлялі свае кандыдатуры і г. д.

Існуюць і іншыя пласты насельніцтва, якім не па душы комуністычнае будаўніцтва, гэта: мяшчанства, гарадзкая і местачковая дробная буржуазія, кулацтва і г. д. Інтэлігэнцыя сутыкаючыся з адпаведнымі сацыяльнымі у групаваньнямі, бязумоўна ўспрымае некаторыя элемэнты іх ідэолёгіі і абараняе іх, пераносячы барацьбу ў сфэры ідэолёгічныя.

Вось якрас карэньні адыходу „Узвышша“ ад „Маладняка“ трэба шукаць у тых спрэчнасьцях, якія цяпер існуюць паміж прыхільнікамі праўдзівага мастацтва с комуністычна-пралетарскімі пісакамі.

З гэтага бачым, што „Узвышша“ не адарвалася ад народу—а ёсьць выразіцелем, —праўда ў слабой меры, інакш улада не пазволіць, — ягоных настрояў. І наадварот: „Маладняк“ ёсьць афіцыёзам комсамолу.

Становішча сябраў „Узвышша“ нэўне не надта завіднае. Але яны ўжо маюць перад сабой сьветлую мэту. Яны яшчэ ў цемры і блутаюцца, толькі недзе здалёк ім пачынае сьвяціць вейкая зорка. Гэта добра выказвае адзін з ідэолёгаў „Узвышша“ Ул. Дубоўка, літэратурную творчасьць якога „Беларускае Слова“ ўжо разглядала:

У імкненьні вечным, у імкненьні чыстым,
Я іду наперад
Мыбыць не адзін.
Мэта сьвеціць зоркай, зоркай прамяністай,
Ды чаму-ж пад змрокам стужкі пуцявін?
Я іду праз пушчу, я іду праз вецер,
Навальніца плача
Пошчак не заціх...

Аднак, відаць, шлях гэты не зусім лёгкі, бо:

... Па над маей сьцежкай той агонь ня сьвеціць,
Што ў маім сэрцы і ў вачах маіх... і г д.

Зусім выразна і з некаторай доляй цынізму кажа аб мэтах савецкае літэратуры і аб тым, чаго патрабуе комуністычная ўлада ад літэратуры і якой толькі яна можа быць камісар Адамовіч:

„Чаго мы патрабуем ад літэратуры наагул і ад „Маладняка“ ў прыватнасьці? Перш за ўсе мы хочам, каб пралетарская рэвалюцыя, барацьба рабочай клясы і яе далейшая творчая праца знайшлі-б свой адбітак у нашай пралетарскай літэратуры. Пры гэтым, творы нашых пісьменьнікаў, гаворачы аб нашым будаўніцтве, павінны па марксыцкі асьвятляць усе праявы жыцьця і барацьбы рабочай клясы; трэба каб сялянства апісывалася не як нешта цэлае, аформленае, якім прадстаўляюць яго сабе дробна-буржуазныя пісьменьнікі (ківок у бок „Узвышша“. Рэд.), а каб пісьменьнік бачыў жывыя тыпы кулака, серадняка і бедняка ў клясавым разрэзе, г. зн. каб кулак быў выяўлены іменна як вораг бедняка і серадняка.“

„Беларуская література павінна выхавацца ў духу ненавісьці да нашага класавага ворага“.

Пад кулаком мы можам разумець кожнага замажнейшага селяніна. Цікавыя павінны быць узаемаадносіны ў Радах, калі галава ўраду цкуе бяднейшых на замажнейшых. Ды і ці можна лічыць прапаганду ненавісьці, цкаваньне бедняка і серадняка на больш заможнага селяніна — літэратурай, пясьнярствам чыстае красы?

Не дарма Язэп Пушча, сябра „Узвышша“ піша па адрэсу маладнякоўцаў:

Наліліся словы
Дзікім ядам,
Скамянела
У сэрцы злосьць.
Зрок упіўся ў сінь
Сухім паглядам,
На душы.
Бясьсільля золь.
Кожны з іх
Узьняў руку
На брата:
„Угробім
Мы жывым яго“...

Гэта якраз тое, чаго хочуць розныя Адамовічы.

І з безнадзейным сумам канчае Пушча гэты верш:

Гнеўных струн
Больш пальцамі
Ня кратаць.
Згасьне
Юны пал-агонь...

Німа месца сапраўдным пісьменьнікам ў Саўдэпіі, бо прападуць безкарыстна іх сілы,—згасьне юны пал агонь!

Ня будзем слухаць таго, што пяюць тут нам бальшавіцкія падгалоскі аб Савецкім раю—бо яны сьвядома, за добрую аплату, маняць. Лепш кінем вокам на тое, што сапраўды там робіцца. І што-ж мы бачым? А тое, што бальшавікі перасьледуюць усё культурнае, усё мастацкае І сьвятой праўдай будзе тое, што бальшавіцкі гнёт горшы за татарскі, бо бальшавікі выявілі сябе большымі ворагамі культуры—чым дзікія татары.

Наша беларуская культура маладая і слабая, вялікіх цэннасьцяў мы ня маем.

Але мы маем магутны народ, які у сваіх нетрах таіць вялікія сілы, таіць будучых вялікіх мастакоў і паэтаў. І ужо камень за каменям рукамі нашых песьняроў і пісьменьнікаў будуецца вялікі гмах нашае нацыянальнае культуры. І ня глядзючы на ўсе высілкі і прымус з боку бальшавікоў, каб беларускую нацыянальную творчасьць пакіраваць па шляху інтэрнацыянальна-пралетарскай „практычаскай“ агіт-літэратуры — дух народу возьме верх і гмах беларускай культуры вырасьце гэткім, якім ён павінен быць, адпавядаючы павазе і ўнутраным сілам беларускага 12 мільённага народу.

(Канец).

Барыс Рмурскі.

у Нікарагуа і выслала на амэрыканскую граніцу свае войскі. Магчыма, што ўспыхне вайна.

Апрача таго мела Мэксыка шмат хлапот і ў сябе ўнутры. У краі пачалася рэвалюцыя. Урад абвінавачаў у непарадках каталіцкае духавенства, з якім пачаў сурова распраўляцца.

Апошнія весткі гавораць аб тым, што рэвалюцыя ў краі прыдушана, але за тое канфлікт са Зл. Штатамі яшчэ больш завастрыўся.

САВЕЦКА-ЛІТОЎСКІЯ АДНОСІНЫ. Паведамляюць з Коўні, савецка-літоўскія гандлёвыя перагаворы адложаны на неазначаны час. Савецкі пасол у Коўні Александроўскі, пакідае свой пост, прычым на яго месца праз другі час нікто назначаны не будзе.

Літоўская газэта „Летувас" піша, што у той час, як у Расеі былі забіты мільёны людзей, нікто не пратэставаў. Калі ж у Літве на прыгавору суда была расстраляна 4 комуністы, дык Савецкая Расея мабілізуе ўвесь комуністычны сьвет процім Літвы і асыгнуе 50 мільёнаў літаў на бальшавіцкую прапаганду.

Газэта „Рытас" адмечае, што Александроўскі зьяўляецца не толькі паслом Савецкага ўраду, але і прадстаўніком комінтэрну, і што ў яго заданьні ўваходзе — выклікаць бальшавіцкую рэвалюцыю ў Літве.

РАЗРУХІ У КІТАІ. З пачаткам Новага Году асабліва актыўнасьць выявілі кітайскія бальшавікі. У некаторых вялікіх гарадох як Шанхай дашло да паважных разрухаў. Пачаў варушыцца і чырвоны Кантон. Каб зламаць лінію антыбальшавіцкіх войск на чале з гэнэраламі Чанг-Со-Лінам Ву-Пэй-Фу і Сун-Фангам было паднята паўстаньне ў мясцовасьці Чэ Кіанг. Аднак усё бальшавікам не пашчасьціла і паўстаньне было сурова задушана.

Крыху горай справа была ў Шанхаі, дзе кітайцы пачалі нападаць на эўрапэйцаў. Толькі прыбыцьцё 600 матросаў выратавала палажэньне.

З пачаткам лютага трэба спадзявацца ў Кітаі рашучых баёў паміж белымі і чырвонымі.

ІЗНОЎ КРЫВАВАЕ СЯЛЯНСКАЕ ПАЎСТАНЬНЕ У.С.С.Р.Р. Паводле вестак з Менску ў Астроўскім павеце Пскоўскай губэрніі ізноў распачалося крававае сялянскае паўстаньне.

Першае паўстаньне увосені мінулага году было спынена галоўным чынам таму, што ўлада зрабіла шмат абяцанак. Аднак абяцанкі выпаўнены не былі — наадварот сялянскае дорага заплаціці за тое, што паверылі Г.П.У. мела даволі работы.

Дык цяпер пачалося новае паўстаньне,— але ўжо у больших размерах Савецкая ўлада сьцягнула ў апанаваныя паўстанцамі раёны шмат войска. Кожны - хто пападаецца з аружжам у руках — без суда расстрэльваецца.

Зямельная рэформа праводзіцца.

Ня гледзячы на тое што правыя польскія газэты валі і вядуць страшэнную кампанію процi правядзеньня ў жыцьцё зямельнае рэформы, — вядомы віленскі дэмакрат міністар Станевіч са згоды маршалка Пілсудскага выдаў дэкрэт аб прымусовай парцэляцыі некаторых маёнткаў. На беларускіх абшарах зямлю будуць браць з гэтых маёнткаў:

У Баранавіцкім пав. маёнт. 1) Жэлудок, ўласнасьць Яр. Патоцкага — 280 гэктараў; 2) з Ляховічаў, уласн. Станісл. Кассаноўскага — 300 г.

У Гарадзенскім пав. 1) З маён. Масаляны, уласн. Яна Бісьпінга 300 г; 2) з маён. Баяры, ул. Красінскай — 150 г; 3) з м. Скідаль, ул. К. Чатвертыньскага — 160 г; 4) з м. Чэрлёна, ул. М. Любамірскай — 120 г.

У Лідзкім пав. 1) з м. Жалудок, ул. М. Чатвертынскай — 100 г; 2) з м. Іўе, ул. Г. Замойскага — 200 г; 3) з м. Дзенгарова, ул. Аст. Сапегі — 100 г; 4) з м. Шчучын, ул. М. Друцкай-Любецкай — 350 г; 5) з м. Нясьвіскага ул. Альбр. Радзівіла — 225 г.

У Навагрудзкім пав. 1) з м. Любча, ул. Ст. Юндзіла — 150 г; 2) з м. Наталіна, ул. Янкі Вэранцова — 400 г; 3) з т. Сынковіч, ул. Л. Гуттэн-Чапскай — 150 г; 4) з м. Ключ Альбэртынскі ул. Вл. Пуслоўскага — 100 г; 5) з м. Хотаў, ул. З. Незабытоўскай — 150 г.

У Вайкавыскім пав. 1) з м. Струбніца ул. Вл. Біспінга — 100 г.

У Валожынскім пав. 1) з м. Лаздуны, ул. Г. Корвін-Мілеўскага — 500 г.

У Пастаўскім пав. 1) з м. Варапаева, ул. К. Пжэздзецкага — 276 г.

У Лунінецкім пав. 1) з м. Леніно, ул. супалкі Дзераўл. прам. — 600 г; 2) з м. Навасёлкі, ул. лясн. т-ва — 200 г.

У Пінскім пав. 1) з м. Параханьск, ул. З. Чаховіч-Ляховіцкай — 600 г; 2) з м. Бярэзічы, ул. Міх. Орды — 600 г; 3) з м. Ненковічы, ул. К. Тукальскага — 400 г.

У Столінскім пав. з Давыдгародскай ардынацыі, ул. М. Радзівіла — 800 г.


Мэмарандум праваслаўнага зьезду.

У пачатку студня адбыўся ў Варшаве Праваслаўны Зьезд.

13 Студня дэлегацыя зьезду даручыла маршалкам Сойму і Сэнату і сяброи Ураду гэткі мэмарандум:

Праваслаўнае духавенства і надалей ад усяго сэрца жадае верна служыць інтарэсам польскае дзяржавы і дзеля гэтага просіць урад аб дапамозе ў гэтай карыснай для дзяржавы, працы прымаючы пад увагу гэткія яго жаданьні: 1) Прысьпяшыць устанаўленьне прыўнае сытуацыі польскага праваслаўнага касьцёла праз вышэйшую духоўную ўладу; 2) даць усяму праваслаўнаму духавенству, як блізкаму на лёлькаму ў адносінах да дзяржавы, права польскага абывацельства. 3) зграніцыць у адносінах да духавенства камэнтэльцаў савецкае ўлады на мясцох, даючы духавенству ў кожным выпадку магчымасьць баранiцца перад закідамі шляхам суда: 4) запэўніць праваслаўнаму духавенству грашовую дапамогу са скарбу дзяржавы і забясьпечыць землёй, хаця-б у такіх размерах, якія выказаны ў статуце, зарабованым вышэйшай уладай праваслаўнае царквы; 5) да часу зацьверджаньня статуту і правядзеньня ў жыцьцё забесьпячэньня землёй духавенства шляхам вызначэньня для праваслаўнае царквы, вызначанае ў памянёным статуце колькасьці зямлі, устрымаць парцэляцыю царкоўных земляў, пакінуўшы іх на далейшае валаданьне манастыром і парахвіям; 6) прыняць пад увагу просьбы праваслаўных парахвіян аб адчыненьні тых царкваў і парахвіяў, каторыя былі зачынены ў апошнія гады і надалей прыхільна разглядаць падобныя просьбы, бо кожная парахвія зьяўляецца лішняй апорай крэпасьці і спакою на толькі для царквы але і для дзяржавы.

Забойца Петлюры.



Жыд Шварцбарт, забойца ўкраінскага атамана Петлюры.

У С. С. Р. Р.

Амністыя Калініна.

Знаходзячыся ў Ніжнім Ноўгарадзе старшыня Калінін памілаваў 260 вязьняў, якія сядзелі ў ніжагародскіх турмах. Савецкія газэты з задаваленьнем адмячаюць, што ўсе вязьні сялянскага і работніцкага паходжаньня.

Цікава тут тое, што ў савецкіх турмах сядзяць ужо не буржуі і контррэвалюцыянэры, а... работнікі і сяляне.

Колькі гарэлкі выпівае сучасная Расея.

Савецкая прэса падае цыфры датычачыя спажываньня алькаголю ў краі. Паводле гэтай статыстыкі продана (у тысячах вёдраў):

у маі	854,6
у чэрвені . . .	1061,7
у ліпні . . .	2120,0
у жніўні . . .	2437,7
у верасьні . . .	2657,7
у кастрычніку . .	2713,4
у лістападзе . .	2863,7

Як відаць у працягу 7 месяцаў спажываньне алькаголю узрасло з 3 з палоўай разы. Узрост наступіў дзеля таго, што былі скасаваны аграніченьні продажы гарэлкі.

Гэткім чынам бюджэт савецкае Расеі, як і за царскіх часоў, чарпае вялікую частку сваіх даходаў з гарэлкі.

Зьдзек бальшавікоў над рэлігіяй.



На Іверскай Браме Божае Маткі ў Маскве, якую шануюць усе праваслаўныя, бальшавікі зрабілі сфатаграфаваны вышэй надпіс і прымацавалі чырвоную зьвязду.

Паўтара мільёна пудоў пшаніцы згніла...

На станцыях ўсходнесыбірскае чыгункі ў вагонах знаходзілася больш як паўтара мільёна пудоў пшаніцы. Цяпер высьнілася, што гэтая пшаніца пачала гніць, бо вагоны працякалі. Дык і прадаецца за бясцэн на корм для жывёлы.

Гэта ўжо сапраўдныя плады савецкае гаспадаркі.

ЖЫЦЬЦЁ ПРОВІНЦЫІ.

Брахня грамадаўскае газэты.

„Наша Справа" № 1 запярэчыла таму, што разваліліся грамадаўскія гурткі ў в. Махначы і Петралевічы ў Слонімшчыне.

У сувязі з гэтым з Слонімшчыны нам пішуць:

Гурток у в. Махначы, Міжэвіцкай гм. Слонімскага пав. сапраўды разваліўся, а правадыр — комуністычны дзенч Якута, пасьля гэтага знайшоў прытулак у Міжэвіцкім гуртку. У запярэчаньні „махначан", якое было надрукавана ў № 1 „Нашай Справы" гаворыцца, быццам гурток з Махначоў злучаецца з *сілаю* Міжэвіцкага гуртка. Гэта фальш. Злучаецца толькі... правадыр *без сябраў*, якіх няма.

Тутэйшыя сяляне ўжо асудзілі гэтае запярэчаньне, як фальш.

Тое самае і ў Петралевічах. Правадыры гэтага гуртка Мамай і інш. пасьля развалу шукалі парады і апекі ў Паўтовым Сэкрэтарыяце ў Слоніме. Сэкрэтарыят зрабіў „запярэчаньне і выслаў да рэдакцыі „Нашае Справы", для падтрыманьня духа іншых гурткоў у Слонімшчыне.

Адначасова з гэтым быў высланы цэлы штаб агітатараў да в. Петралевічы, каб наладзіць працу, якая „парвалася".

Нікто таксама не чуў у Петралевічах аб арганізацыі гуртка Т-ва Беларускае Школы. Няпраўда, быццам Мамай распачаў „працу" па арганізацыі гуртка ў Альбэрціне Гурток Грамады раней там быў арганізаваны, чым у Петралевічах. Гутарка можа быць толькі аб „рэарганізацыі, — бо нешта апошнім часам сапсаваўся ў Альбэрціне.

Гішпанка на вёсцы.

(*Слонімшчына*).

І на вёсцы людзі хварэюць на гішпанку, хвароба ўсё больш пашыраецца. Хаця ў Слоніме і ёсьць „Powiatowy Urząd Zdrowia", аднак карысьці з яго німа ніякае. Лепш было-б назваць яго „Powiatowy Urząd Chory" — аб гэтым можа кожны пераканацца хто толькі завернецца туды за парадай.

„Гмінная Рада".

(*Міжэвічы*).

Вялікая ростам, дык малая розумам нашая гмінная рада! Гэтак яна вынясла пастанову, каб на мейсцы — дзе раней была школа, якая згарэла — паставіць новы будынак, спецыяльна для міжэвіцкае паліцыі.., „Wydział Powiatowy" даў гэтым паліцэйскім прыхвасьням гэтакую навуку: „Перш трэба паставіць школу для дзяцей, а не бу-

Маленькі фэльетон.

У Менскім Трыбунале.

(*Глядзі „Беларускае Слова" №№ 29, 30*).

Абаронца: (падымаецца) Выбачайце, грамадзянін Старшыня, але... прашу яшчэ ў справе Валэйшы... Маленькае запытаньне падсуднаму...

Старшыня: Прашу вас...

Абаронца: Калі ласка, падсудны, вось вы казалі, быццам у Вільні ня было вывіна зьніводнага беларуса?.. Можа вы памыліліся?.. Калі ласка, прашу ўспомніць, ці-ж гэта так?!

Падсудны маўчыць і зьдзіўлена паглядае на абаронцу..

Экспэрт Міхась (ўстае і да судзеяў): Выбачайце... але я магу дапамагчы падсуднаму... бо я, як быўшы пасол...

Старшыня: калі ласка, прашу,

Экспэрт Міхась: А сэнатара, Францішэк, сэнатара запамятаваў?! Ці-ж забыўся, як мы з табой яшчэ сядзелі ў „Саркасьвнцы"...

Падсудны: Што?!.. Што!.. (прыкладае руку да галавы) А-а!... Багдановіча?! . Далібог зусім запамятаваў!.. (да судзеяў). Сапраўды ў Вільні быў выбраны адзін сэнатар...

Абаронца: Ах, вы успомнілі!.. Быў такі выбраны сэнатар!.. Ну дзякую.. Я больш нічога... (садзіцца, зірнуўшы ў бок абвінавацеля).

Галасы з публікі: Брава!..

Голас Любачкі: Францішэк! Малайчына!...

Абвінавацель: (падымаецца і ў бок абаронцы: „я табе пакажу зараз тваіго сэнатара"). Калі ласка, падсудны, скажыце, а якога палітычнага напрамку быў гэны сэнатар! Што?!.. Манархіста расейскі?!.. Дзякую... я больш нічога... (садзіцца і пліпрае рукі).

Галасы з публікі: далоў манархіста! Няхай жывуць Саветы!..

Абаронца (ізноў ўстае) А ці памятаеце вы, падсудны, хто выстаўляў кандыдатуру гэнага сэнатара?!.. Ах, Беларускі Цэнтральны Камітэт!!.. Ах, Антон Луцкевіч!!.. Больш нічога... (садзіцца).

Старшыня: больш пытаньняў па 2 пункту няма?.. Не?!.. Пераходзім да 3-га пункту...

— Шш!... Шш!... пранясьлося ў публіцы...

— Слухайце!... Слухайце!... пра бандыту фашыстоўскага зараз пачнецца!...

— Тутака ён ужо не адвярэціца!...

— Ня выкруціцца, як з Валэйшай!...

— А хто іх разьбярэ, калі тамака ўсё пераплуталася?!... І палякафільныя, а нашыя з імі працуюць, быццам разам...

— Ша... Шш!... Глядзіце, глядзіце, што гэта робіцца з падсудным...

А падсудны зьбялеў зусім... Нэрвова і апалелымі вачыма паводзіў то на судзеяў, то на абаронцу, і калі абаронца неяк не заметна падмігнаўшы яму, ён раптам ўхапіўся за галаву, сьціснуў яе, затаптаўся на мейсцу і пачаў неяк кінацца ўлева і права — быццам каўсуся, быццам сам сябе вінаваціў у чымсь і дзівіўся, як гэта ўсё магло стацца... А пасьля нібы ў корчах нейкіх пачаў ламаць рукі... хапаўся за каўнер, як бы яму паветра мала было.. дыхаў коратка, перарывіста, на'т задыхаўся і хрыпеў і з бледога зрабіўся зусім чырвоным і ўвесь абліваўся потам.

І гэтыя ягоныя быццам душэўныя перажываньні адчуліся і за судзейскім сталом, і ў публіцы стала ясна, што з ці пункт абвінавачаньня акту найбольш абходзіць падсудна...

— Бач ты, як яго ўзяло?!... Пачуўся шопат у публіцы...

— Быццам хвароба Вітаўская схапіла!...

— Гэта ад „адозваў" Тымчасовай Рады яго так корчыць...

— Руні, рукі ўжо пачаў ламаць?!

— Ну ведама — артыста' дык і ламаецца..

— Во, во... бачыце?.. У кішэню нешта палез!..

— Ой, браткі мае! як выцягне зараз бомбу, дык як трэсьне...

— А што-ж вы думаеце — артысты на ўсё здольны...

— Не дарма з фашыстоўскім бандытай працаваў!...

Дык, як кажуць, з прыемнасьцю!..

Артысты Дзяржаўнага Тэатру з першых радоў паглядалі на падсуднага, як на таварыша па прафэсыі і яго-

ныя мукі ацэньвалі па своему:

— А добра грае!... Добра!...

— А галоўнае вытрымана: адразу адчуваеш тып праступніка, які пачаў у душы ўжо каяцца і зараз прызнаецца..

Вось бы гэтак на нашай сцэне, па дзяржаўнай...

— Ого!.. Стаўка першай катэгорыі!...

— Але-ж канкурэнцыя!...

Абвінавацель толькі іранічна пагладаў...

Ламаеца стары камэдыянт думалася яму — мы табе пакажам „з прыемнасьцю"!...

І толькі адзіны абаронца сядзеў зусім спакойна быццам нічога і, як здавалася не падсьмейваўся ў душы:

— Брава, брава! усё як па масьле... яшчэ толькі крыху і можна пачынаць..

Галасы з публікі: Годзі камэдыю граць!..

— Ужо бачым, што будзе прызнавацца!...

— Годзі, досыць!...

— Далоў камэдыянта!...

Падсудны, як бы ачнуўся — што?!... — выпраставаўся і, зірнуўшы на падміргнуўшага яму абаронцу, раптам павярнуўся да публікі — Што?!... Для вас камэдыя, а ўмяне тутака трагікамэдыя — і ён пастукаў правай рукой нібто па сэрцы, нібто па бакавой кішэні сурдута — ня верыце?!... што?! дык я дакажу вам... і хутка палез у бакавую кішэню...

— Галасы з публікі: Ой, вай! Гашпадзін судзя! Штраляць будзе!...

— Ой ратуйце!...

Голас Любачкі: Францішэк, даражэнькі!.. Бога бойся, што ты робіш?!...

Старшыня пазваніў.. Дзяжурны прыстаў і 2 паліцэйскія падскочылі да падсуднага.. У дзьверах паказаўся атрад чырвона-армейцаў...

Экспэрт Міхась прыплюшчыў вочы, схіліў галаву і рукамі прыцiскаў вушы...

Падсудны (выцягнуў з кішэні досыць грубы сшыток, зьвёрнуты ў трубку і пераязаны чырвонай лечткай і трымаючы у паднятай руцэ да публікі) Што ня, верылі?!..

Вось мая трагікамэдыя. Вось крык нахварэўшае мае душы! Вось апошняя мая лебядзіная песьня з жыцьця сучасных палякафільных беларускіх дзеячоў... (да судзеяў), Вось, паважаныя судзі, тутака знойдзеце ўсё, як на далоні — і маё жыцьцё і чаму я прыстаў да Валэйшы і дзеля чаго абдумана, у поўным розуме і ў „здравым разсудку", без прымусу, па ўласнай волі і ахвоце, на'т з прыемнасьцю ўвайшоў у арганізацыю фашыстоўскае бандыты Паўлюкевіча" і амаль што да гэтага часу працаваў у яго. Перад вамі, паважаныя судзі, як у кіна, на'т як жывыя, пройдуць усе тыпы гэных дзеячоў з іхнымі арганізацыямі, клюбамі, зьездамі, спэцамі, зіцрэдактарамі, радчыкамі, дарадчыкамі і іншымі прыхвасьнямі руху беларускага з былых людзей... Я яшчэ раз паўтараю, што з прыемнасьцю ўвайшоў у іхняе жыцьцё... Голас з публікі: гэта-ж здзецца, называецца правакацыя!?..

Падсудны (сьмеецца) гы, гы, гы!.. Паважаныя судзі! Паважаныя экспэрты!... Ці-ж гэта правакацыя?! Як у вас лічыцца?!

(*Канец будзе*). Г-ва.

Адозва Беларускай Нацыянальнай Рады.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Вашая НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РАДА не адзін раз папераджала Вас аб тэй небясьпецы, якая пагражала Вам і беларускай справе ад пралетарска-бальшавіцкай „Грамады“ І не пасьпела Рада, з адсутнасьці сродкаў, разаслаць свае апошняй адозвы, выдрукаванай у „Беларускім Слове“ ад 5 га Студня г. г., каб яшчэ раз гукнуць па ўсіх далёкіх і глухіх кутках беларускіх аб небясьпецы, якая пагражала ўсім тым, хто лёгкаверна, а хто праз ашуканства трапіў да „Грамады“... як сталася...

УНАЧЫ З 14 НА 15 СТУДНЯ ПА ЎСЕЙ ТЭРЫТОРЫІ ПОЛЬШЧЫ а перад усім у Варшаве і ваяводзтвах Наваградзкім, Віленскім, Беластоцкім і ПалескімАДБЫЛІСЯ АРЫШТЫ.

Аграмадным матэрыялам, які быў знойдзены пры арыштах і вобысках было сцьверджана, што „ГРАМАДА“ БЫЛА Ў ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ З КОМІНТЭРНАМ, была праз яго СУБСЫДЗЯВАНА І ВЫПАЎНЯЛА ЯГО ПРЫКАЗЫ І РАСПАРАДЖЭНЬНІ.

Як афіцыяльныя камунікаты Улады, так і ўся польская прэса, не выключаючы левай, падаюць нязвычайныя рэзультаты вобыскаў. Гэтак прэса падае, што „Грамада“ гатавала паўстаньне з мэтай далучэньня Заходняй Беларусі да Беларусі Савецкай. Усе грошы на работу „ГРАМАДА“ АТРЫМЛІВАЛА З МЕНСКА і МАСКВЫ.

Што пры вобыске ў Цэнтральным Камітэце „Грамады“ ў Вільні знойдзены квіты на грошы ад Г. П. У у Менску. У КАСЕ ГЭТАГА-Ж КАМІТЭТУ ЗНАЙШЛІ ВЯЛІКУЮ СУМУ ДАЛЯРАЎ. Знайшлі даляры і ў правадыроў „Грамады“. Грошы былі перасланы праз Гданск ад бальшавікоў.

Знойдзены інструкцыі комуністычнай партыі і спэцыяльныя ШЫФРЫ для найбольш тайнай карэспандэнцыі. Знойдзены комуністычныя ШТАНДАРЫ І АРУЖЖА.

Справа аказалася настолькі паважнай, што Улада не застанавілася перад арыштам нятыкальных паслоў — арыштаваны паслы ТАРАШКЕВІЧ, РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, ВАЛОШЫН і МЯТЛА. Як гэтых паслоў, так і іншых арыштаваных грамадаўцаў абвінавачваюць у здрадзе і шпіёнстве на карысьць бальшавікоў, а сама „Грамада“ зьяўляецца арганізацыяй антыдзяржаўнай.

На гэты раз за рэвалюцыйную дзейнасьць адказваць будуць ня толькі звычайныя шэрыя сяляне-грамадаўцы, але і нятыкальныя ПАСЛЫ, ЯКІЯ НЕ ПАСЬПЕЛІ ЎЦЯЧЫ Ў ГДАНСК, бо не спадзяваліся, што Улада пераступіць праз іх пасольскую нятыкальнасьць і арыштуе іх. Пасла РАК-МІХАЙЛОЎСКАГА арыштавалі ў мамэнт, калі сядаў да цягніка, які адпраўляўся ў старану Баранавічаў З МЭТАЙ УЦЯЧЫ ДА БАЛЬШАВІКОЎ.

Гэткім чынам адкрытыя заявы Беларускай Нацыянальнай Рады аб тым, што „Грамада“ ёсьць арганізацыя комуністычная, аказаліся праўдай. Гэткай-жа горкай праўдай аказаліся і тыя словы перасьцярогі, якімі Нацыянальная Рада ня раз, пачынаючы яшчэ ад 16 жніўня 1926 году, папераджала сялян ад небясьпекі перад „Грамадою“.

Але мы пэўны, што ўлада добра разумее, што вінаваты ня тыя, хто пры сваей цемнаце і бяз хітрасьці, ў немагчыма цяжкіх варунках жыцьця, пайшлі за ашуканчымі абецанкамі „Грамады“. ВІНАВАТЫЯ НЯ ТЫЯ ТЫСЯЧЫ СЯЛЯН-ГУРТКОЎЦАЎ, ЯКІЯ НЯ ВЕДАЛІ ШТО РАБІЛІ ўпісваючыся ў „Граммаду“, гдзе ім абецалі і зямлю і школу і ўсе даброцьці зямныя.

ВІНАВАТЫ ВЫКЛЮЧНА ПРАВАДЫРЫ І УСЕ ПЛАТНЫЯ АГЭНТЫ, А НЯ БЕДНЫЯ СЯЛЯНЕ, з якіх правадыры безсумленна дралі апошнія грашы на сяброўскія складкі, маючы па сваіх кішанях, банках і камітэтах, тысячы даляраў.

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РАДА, якая ўвесь час вяла барацьбу адкрыта з „Грамадою“, як арганізацыяй комуністычнай і інтэрнацыянальнай, гэтым сяньня ПАДЫМАЕ СВОЙ ГОЛАС У АБАРОНЕ грамадаўцаў. Не правадыроў, не эмісараў бальшавіцкіх, не агэнтаў і шпікоў, а той ШЭРАЙ СЯЛЯНСКАЙ МАСЫ, ЯКАЯ НЕ ВІНАВАТА, бо яна несьвядомая, яна цёмная, яна бедная.

І мы пэўны, што рэпрэсыі і арышты незачэпяць гэтых сялян. Але, Грамадзяне гэта перад усім будзе залежаць ад Вас саміх

Тыя, хто з Вас трапіў да „Грамады“ несьвядома, зразумейце, што адзіным сродкам ратунку для Вас ёсьць поўнае ачышчэньне ад грамадаўскай заразы. Тыя, хто пайшоў сьвядома, ідучы да „Грамады“ як да арганізацыі нацыянальна—беларускай, павінны прызнаць сваю памылку, бо ці ж 3-ці Інтэрнацыянал можа зьдзейсьніць нацыянальныя і сацыяльныя імкненьні Беларускага Народу.

Дык, Грамадаўцы па памылцы! Ачышчайцеся аканчальна ад грамадаўска-комуністычнай заразы.

Грамадзяне, уплывайце на сваіх суседзяў. Майце на ўвазе, што інтэрнацыянальная „Грамада“ нанясла вялікі ўдар нашай нацыянальнай справе. НЯ МОЖНА ДАПУСЬЦІЦЬ, КАБ ПРЫ ЛІКВІДАЦЫІ „ГРАМАДЫ“ МАГЛІ ПАЦЯРПЕЦЬ НАШЫЯ КУЛЬТУРНЫЯ ЗДАБЫЧЫ. І мы пэўны, што сучасны Урад, вядучы барацьбу з комуністычным рухам, які пагражаў усей Дзяржаве, ня толькі ня пойдзе процiў нацыянальных нашых імкненьняў, але, што УСЬЛЕД ЗА РЭПРЭСЫЯМІ ПРЫЙДУЦЬ РЭФОРМЫ, ЯКІЯ аканчальна паралізуюць уселякія акцыі бальшавікоў на нашых землях.

Дык ГРАМАДЗЯНЕ! МАЦНЕЙ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ У НАШЫМ ЗМАГАНЬНІ ЗА НАШЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ІДЭАЛЫ!

Яшчэ крапчэй стойце за свае правы, ТРЭБУЙЦЕ РЭФОРМАЎ, але памятайце, што перад усім Вы павінны ачысьціць з сябе тую пляму, якую на Вас налажыла Грамада. АДЗІНАЯ ДАРОГА зьдзейсьненьня нашых жаданьняў—гэта РАШУЧА І АКАНЧАЛЬНА ПАРВАЦЬ З КОМУНІСТЫЧНАЙ „ГРАМАДОЮ“ І ЕДНАЦЦА КАЛЯ СВАЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РАДЫ.

17 Студня 1927 г.
Вільня.

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РАДА.

дынак з арыштамі і для паліцыі“. Справядліва! Сорам і ганьба „радным“, якія хацелі прыпадабацца паліцыі. Паліцыя можа хоць дзе пражыць, а дзеткам трэба ставіць школу. Пытаюся: дзе яшчэ ёсьць такая дурная „рада гмінна“, як у Міжэвічах.

Школы, школы трэба — а не спэцыяльных будынкаў для „przodowników“, каторыя добра могуць пражыць і ў простай сялянскай хаце.

Культурнік.

Слонімская хроніка.

— Ад 1 студня слонімскі староста Брон. Пшэцішэўскі, адыйшоў да „Urzędu Wojewódzkiego“ ў Наваградку. На яго месца вызначаны новы староста Др. Дорош.

Чакаем палепшаньня нашай долі.

— Ленкевіч, сэкратар і Каспэрска—канцэлярыстка з „Pow. Urzędu Ziemskiego“ звольнены з пасады. Ленкевіча ведае кожны, хто меў зямельную справу і быў прымушаны хадзіць да гэтага „пана“ па інфармацыі.

— У м. Дэрычын заложана 2 студня ў Народным Доме радыё.

— У хуткім часе ў в. Селявічы будзе заложана радыё. Дагэтуль сабралі 250 зл. Радыё каштуе 500 зл.

Чэсьць і слава тым людзям, ад якіх выйшла ініцыятыва і якія даюць грошы на радыё.

Загляне сонца і ў нашае ваконца.

(*Слонімшчына*)

Сярод сялян Слонімшчыны ідзе ацьверазеньне. Падымаюцца, як гром, галасы процi Грамады нават тых асоб, якія з прыемнасьцю глядзелі ў пачатку на хуткі рост Грамады. Засьляпленьне праходзіць! Першыя паказалі прыклад махначане, зьліквідаваўшы свой гурток. Потым Пятралевічы, Селявічы — гдзе скарбнік паказаў прыклад.

Больш паважныя сяляне проста і кажуць: Грамада і яе гурткі — гэта банда! Скардзяцца на гэтае самі грамадаўцы ў „Н. Справе“ N. 1.

Народны гнеў процi чырвонай банды ашуканцаў і ўгалоўнага элемэнту расьце.

У в Зборна ўжо выяўляюцца ўспышкі гэтага народнага гневу і падымаюцца галасы проці ашуканцаў.

Палітыка Грамады — гэта бура, якая пачынае праходзіць. Выгляне пасьля сонца і заліе яснымі касулямі многапакутную нашу Бацькаўшчыну.

Прападуць тады Луцкевічы, Валошыны, Мётлы, Бурсэвічы і іншая пошкудзь.

Наша Слонімшчына ўстане на шлях нацыянальны і высока падыме беларускі штандар.

Грамадзяне Слонімшчыны! Толькі тады даб'емся шчасьця, калі будзем змагацца з комунізмам у розных відах і будзем шчырымі беларусамі.

Тады загляне сонца і ў нашае ваконца.

Беларус.

Несьвіж.

У Несьвіжы 19 студня адбылася працэсія на Іардань. У працэсіі прынялі ўдзел, апрача масы народу, каля 200 праваслаўных жаўнераў пры афіцэрах і з аркестрам ваеннай музыкі, які іграў „Коль славен“. Урачысты ўдзел войска ў праваслаўным сьвяце зрабіў надта добрае ўражаньне на народ.

Грамадаўскія фатаграфіі.

Літвінчык Базыль з Азёрніцы — сядзеў у турме па 265 ст. К. К.

Ракевіч П. з Клепачоў — сядзеў па 265 ст. К. К.

Добрыян А. з Какошчыц — нядаўна прыйшоў з турмы ў Слоніме.

Скок — сябра гуртка в. Кабакі, у турме.

Сьлiж Міхась — сэкрэтар гуртка ў в. Малое Запрудзе, Забрэскай вол. нядаўна вярнуўся з Лукішскае турмы, у якой прасядзеў 4 гады. Сядзеў за тое, што з іншымі бандытамі напаў на фальварак Машыну, прычым была выразана цэлая сям'я. 2 яго таварышоў расстрэлялі.

Гутко Тодар — прэзэс Хадзеўлянскага гуртка—быў начальнікам павятовае міліцыі.

Шчотка — адміністрацыйна караны.

Сяброуская згода

(Па Крылову).



Нек шчупак,
Лебедзь й Рак
Гружоны воз цягнуць ўзяліся,
І разам ўтрох ў яго ўпрагліся.
І вось працуюць з сіл усіх,
Аж градам пот ільецца з іх.
Так: Лебедзь ўверх у неба рвецца,
Цягне ў возера Шчупак,
А бедны Рак —
Дык аж пыхціць, узад ўсё пнецца.
Для іх запражкі
Вось не здаваўся надта цяжкі,
Дый кожны з іх вельмі стараўся,
А воз на месцы заставаўся.
У чым тут справа, што і як,
Гдзе віна — судзіць ня нам,
Ды вось аднак —
Той воз дагэтуль стаіць там.

Калі няма ніякай згоды,
Між сябраў нат аднэй пароды,
Ня пойдзе справа іх на лад
Ані ўперад ані ўзад;
І хай зрабіць яе ня штука —
Ня дзела выйдзе — толькі мука!

Б. Друцкі.

В Юрэвічы, Дзятлаўскае гм.

Ломаць Юльян — быў камісарам Губчэка ў Адэсе, награбіўшы ў цёк на бацькаўшчыну.

Жамойдзік Астап — быў камісарам залатых прыіскаў.

Фрэнюк Александар — бышы чэкіст.

Вашко Кастусь — служыг у міліцыі, быў караны за падробленьне квіткоў на атрыманьне грошаў.

Мілейка Павал — быў камісарам здравахраненьня недзе ў Саўдэпіі.

К. Р. — Адміністрацыйна караны.

А. Б. — быу начальнікам раённай міліціі ў м. Дзятлаве.

Тутэйшая хроніка.

Урачыстая працэсія на Вадохрышча. На 19 студня прыпадае праваслаўнае сьвята Вадохрышча. У гэты дзень адбывалася вялікая працэсія праваслаўных з усіх віленскіх парахвіяў, пры удзеле войска і вайсковага аркестру. Малыя працэсіі бадай з усіх цэркваў сабраліся да Прачысьценскага Сабору, адкуль разам на чале з архіепіскапам Хвядосам адправіліся на бераг ракі Вяльлі (на Іардань), дзе адбылося асьвяшчэньне вады. Нязьлічаны натоўп праваслаўных прымаў удзел у працэсіі.

Пасьля асьвяшчэньня вады працэсія вярнулася да сабору, скуль ужо ўсе разышліся.

Новая ахвяра Сьмердзякова. Акружны Суд зацьвердзіў арэшт на „Нашую Справу“ № 4, а ахвяру, зіц-рэдактара яе, нейкага Язэпа Запольскага, цягнуць да судовой адказнасьці з арт 129, 154 і 153.

Рэзыгнацыя рэктара Зьдзехоўскага. Вядомы сваей прыхільнасьцю да славянскіх меншасьцяў і ўсімі паважаны рэктар Віленскага Унівэрсытэту, праф. Мар'ян Зьдзехоўскі, зрэзыгнаваў з становішча рэктара, тлумачучы гэты свой крок фізычным вычарпаньнем.

АРГАНІЗАЦЫЯ ГУРТКА „ПРАСЬВЕТЫ“ у ЛІДЗЕ.

Цэнтральная Рада Т-ва „Прасьвета“ атрымала з Ліды гэткую заяву:

Жыхароў места Ліды. Наваградзкага ваяводзтва.

Пратакол.

Каб культура і асьвета ў беларускай мове шырылася і ў нас у Лідзе, мы жыхары гэтага места ня сяньняшнім сходзе выносім пастанову адчыніць у нас мясцовы гурток Беларускага Т-ва „Прасьвета“. За старшыню гуртка аднагалосна абіраем Кастуся Маеўскага (Сувальская вул № 101), за заступніка старшыні Тодара Паўлюкевіча, за скарбніка Пятра Крашэньнікава, за пісара Андрэя Каспорскага.

Пастанову гэтую ўсе мы сцьверджаем уласнаручнымі подпісамі.

Сід.. Уладзімер, Паўлюкевіч Вольга, Лукашэвіч Аляксандар, Бутурля Уладыслаў, Белаус Міхал, Пятроўскі Янка, Вайтовіч Сяргей, Хр.. Уладыслаў, Гутоўскі Якім, Кэпер Надзея, Куд.. Людзьміла, Мілан Уладзімер, Спу... Станіслаў, Паўлюкевіч Балеслаў.

За няпісьменных: Міхала Крашэньнікава і Янку Розальта — расьпісаліся іншыя.

Ліда, 27 сьнежня, 1926 г.

Тыпы сучасные Расеі.



Судзьдзя.



Хлапчук на пасылках.



Паненка.



Малады чалавек.



Прадстаўнік пралетарыяту.



Буржуй.

(рыс. „Мад“а з расейскага журнала „Ил. Россия“).

Ад адміністрацыі.

Значнае павялічэньне разьмеру „Беларускага Слова“ і яго ілюстраваньне вымагаюць вялікіх коштаў.

Дзеля гэтага „Беларускае Слова“ дарма больш нікому, апрача карэспандэнтаў, высылацца ня будзе.

Апошнім бесплатна разасланым нумарам, таму хто прасіў выслаць пробныя нумары, будзе № 3.

Дык хто ня хоча перарыву ў высылцы газэты — няхай зараз-жа паруціцца прыслаць падпісныя грошы.

У крайнім выпадку, калі хто цяпер ня мае грошы на надпіску, няхай паведаміць адміністрацыю—калі іх вышле.

Тады высылка газэты спынена ня будзе.

Адрэс адміністрацыі: Wilno, Fabryczna 39.

Адміністрацыя „Беларускага Слова“.

Адказны Рэд. Т. Вернікоўскі. Друк. Новочасная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Бел. Нацыянальная Рада.